

# АДДЗЕЛ РАМЁСТВАЎ
## І ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ ВЁСКІ ПАЛЯНЫ

***(загадчык установай - Валянціна Казіміраўна Свірская)***

Аддзел рамёстваў і традыцыйнай культуры размешчаны ў вёсцы Паляны ў 8 кіламетрах ад горада Ашмяны, паблізу знакамітага агратурыстычнага аб'екта - конна-спартыўнага цэнтра "Гіпіка".



Гэта самабытны куток нацыянальнай культуры. Майстэрня-музей афармлены ў стылі беларускай хаткі XIX стагоддзя з выкарыстаннем элементаў народнай культуры нашага рэгіёну.







Інтэр'ер памяшканняў спрыяе стварэнню ўнікальнага акружэння натуральнага існаваньня рамёстваў. Пры аддзеле рамёстваў працуюць гурткі дэкаратыўна-прыкладнай творчасці, дзе дзеці вучацца працаваць з саломкай, дрэвам і іншымі прыроднымі матэрыяламі, спасцігаюць асновы вышыўкі, макрамэ, ганчарнай справы, фларыстыкі, саломапляцення. Работы майстроў аддзела рамёстваў і іх вучняў неаднаразова прымалі ўдзел у рэспубліканскіх фестывалях-кірмашах:







Усебеларускім фестывалі нацыянальных культур у горадзе Гродна, міжнародных эканамічных і экалагічных форумах, фестывалі "Гальшанскі замак", кірмашах, святах у горадзе Ашмяны і іншых гарадах Беларусі. Неаднаразова экспанаваліся ў абласным Цэнтры народнай творчасці. Звесткі пра аддзел рамёстваў і традыцыйнай культуры вёскі Паляны ўнесены ў праспект "Ашмяншчына турыстычная". Пры наведваньні ўстановы госці Ашмяншчыны могуць прыняць удзел у майстар-класах, якія праводзяцца па розных відах творчасці, вырабіць сувенір сваімі рукамі. Паляны - радзіма вядомага гісторыка, краязнаўца і пісьменніка Чэслава Янкоўскага.

Адрас ўстановы: Ашмянскі раён, Жупранскі с/с, в. Паляны.
Кантактны тэлефон: 8 01593 7 40 15.